■ Фотаздымак з гісторыяй

# ЗДРАДА

**Вырашыла напісаць пра сваіх бацькоў. Мой тата Ягор Ціханавіч (1907 г.н.) і маці Ніна Іванаўна (1912 г.н.) нарадзіліся ў вёсцы Мхінічы Краснапольскага раёна. Пажаніліся яны ў 1931 годзе і з'ехалі ва Украіну, на Данбас, — зарабіць грошай, каб вярнуцца і пабудаваць дом. Абое працавалі ў шахце. У 1932 годзе нарадзіўся сын, праз год — дачка. Быў вялікі голад, і мама пачала пухнуць. Дачку карміла грудным малаком, магчыма, ад яго тая і памерла ў 9 месяцаў...**

Дзецям давалі паёк. А маме — не, бо яна не працавала. Хлеб прывозілі адзін раз на тыдзень. Мама была слабая, але пайшла на працу, каб атрымліваць паёк. Шахцёрам давалі аднаразовы суп. Голад перажылі, збіралі грошы, у 1937 годзе ў іх нарадзілася яшчэ адна дачка — Марыя. Ішла размова, што будзе вайна, і мае бацькі вырашылі, што трэба з'язджаць. «Другі голад мы не перажывем».

У 1938 годзе вярнуліся на радзіму і пачалі будаваць дом. Але пачалася вайна ў Фінляндыі... І бацьку забралі. Калі ён вярнуўся з вайны, пачалі дабудоўваць дом. Грошай не было, прадалі швейную машынку. У 1941 годзе бацьку забіраюць на перападрыхтоўку на тры тыдні. А праз тыдзень пачалася вайна... Дзе ён праходзіў тую перападрыхтоўку, мы не ведаем... Не паспеў, відаць, ён нам даслаць пісьмо...

У 1941 годзе (27 верасня) нарадзілася я. У акопе. Нашы ў гэты час адступалі, а немцы наступалі. Ішлі баі, у хаце было небяспечна знаходзіцца. Ды і яе яшчэ не паспелі дабудаваць. Дакладней, печкі і вокнаў не было, але цэгла для печкі ляжала. Дабудоўвалі без бацькі. Стаялі ў нас у вёсцы немцы, бо непадалёку знаходзіўся карны атрад. У Журавах, што ў чатырох кіламетрах ад нас, жыла бацькава сястра. Яна даведалася нешта пра бацьку і перадала праз некага, каб мая маці прыйшла да яе. Хадзіць было небяспечна, але мама пайшла. Цётка сказала ёй: прыйшоў Жораў Іван з вайны і паведаміў, што іх полк разбілі і што ён быў разам з маім бацькам... Магчыма, і ён прыйдзе, можа, паранены, а можа, і загінуў. Пайшла мама да гэтага Жорава, але дома яго не аказалася. (Ён на дзень ішоў у лес — баяўся немцаў, бо могуць забраць.) Вось што сказаў Іван сваёй жонцы: «Ехалі мы, дайшлі да ракі, і нам далі каманду спыніцца. Маўляў, немец далёка, разбірайце стралковую зброю і чысціце, а потым будзем пераправіцца на той бок. Сядзім, чысцім... Чуем, самалёты гудуць. Мы галовы задралі, глядзім, раты раскрылі, думаем, нашы ляцяць, а гэта нямецкія самалёты. І пасыпалася нам на галовы... Нам не было чым стрэльнуць, усе бегалі, крычалі: «Здрада! Нам здрадзілі!». Разбілі ўсё, што ў нас было. Я жывы застаўся, сядзеў пад бартавой машынай. Самалёты паляцелі, я вылез і пачаў клікаць Ягора: «Базыль!». Тры разы крыкнуў, але ён не адгукнуўся, і я пайшоў у той бок, адкуль ляцелі самалёты. Пашчасціла, на тое месца, дзе быў разбіты наш полк. Што яны там рабілі, я не ведаю — разглядаць не было калі. І вось прыйшоў дадому».





Мама яшчэ раз хадзіла — яго таксама не было дома. Потым хацела схадзіць на ноч, але мая бабуля яе не пусціла, сказала: «Бацькі няма, і цябе немцы заб'юць. Што я тады буду рабіць з траімі дзецьмі?»

Іван Жораў у лесе далучыўся да партызанаў... З вайны ён не вярнуўся. Так і не ведаем дагэтуль, дзе было тое пабоішча, на якім да гэтага часу ляжаць косці, урослыя ў зямлю. Іх там ніхто не хаваў, бо, як казаў Жораў, вёскі паблізу не было.

Вось так мы і пражылі: самі дабудоўвалі дом, галадалі, у школу хадзіла ў лапцях да трэцяга класа. Паведамлення аб смерці не было. Падавалі запыт, прыходзіў адказ: прапаў без вестак. Плацілі нам па страце карміцельца палову сумы. Раз прапаў без вестак, дык казалі: можа ён дзе жывы ды шыкуе ў Амерыцы. Мама хварэла, быў мокры плеўрыт, лячылі народным сродкам: чорную рэдзьку з газай на хворы бок прыкладвалі.

Неяк прывезлі прадуктовыя пасылкі з Амерыкі. У каго бацька прапаў без вестак, таму не давалі, і нам у тым ліку. Плакала мама каля сельсавета, і, гледзячы на маму, плакалі і мы.

Другі раз, калі прыйшлі іншыя пасылкі, сказалі, што гэта адзенне, будуць даваць усім, у каго загінуў бацька. Прынеслі дадому, давай мераць, глядзець, а яны паклалі адзін бот 44 памеру, а другі 40. Звязаны ўсе, як трэба. Адзін чаравік, адна сандаля або пара з адной нагі, і такой уся партыя пасылак была, якая прыйшла да нас у Мхініцкі сельсавет. Абменьваліся людзі, як маглі. А калі што, то так і насілі: і дарослыя, і дзеці. Вось і дапамагла Амерыка! Гэта ж насмешка, разважце самі.

Дарагая рэдакцыя, высылаю фотаздымак свайго бацькі *(на фота ён справа)*, які ён прывёз з Фінляндыі. На другой картачцы — я і мама. Сястра Марыя абрэзала сябе — яна дрэнна атрымалася, за ёй быў брат Грыша. Фатаграфаваліся ў 1949 годзе. Грошай не было, дык фатограф браў яйкамі. За дзясятак сфатаграфаваў.

**Валянціна ДАНІЛАВА,**
*г. Краснаполле, Магілёўская вобласць*

*Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце парадкуем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.*

■ Маміны дзённікі

Закончыла расказваць Ані гісторыю на сон. Яна пытаецца:

*— А паклон будзе?*

*— Паклон?*

*— Вось, напрыклад, у танцы заўсёды ёсць паклон. Ты цяпер расказала гісторыю без паклону.*

*— У літаратуры гэта завецца эпілог. Заключныя словы пасля аповеду.*

*— Давай назавем гэта лепш паклонам...*

* * *

Аня:

*— Я так баюся, што мяне аднойчы хтосьці папросіць драпаць пазногцямі лёд, і я падрапаю ўсе свае пазногці!*

* * *

Зрабіла Ганначцы сюрпрыз: падарыла дзіцяці тое, што яна не прасіла, але вельмі хацела. Заходзім у аўтобус, кажу:

*— Давай, можа, пакладзем усё ў маю сумку?*

*— Мама, спраўдзілася мая мара, няўжо можна мару пакласці ў нейкую чорную сумку???*

* * *



Аня:

*— Сёння вечар нейкі сабачны.*

*— Чаму?*

*— Ну вось, кнігу пра сабак чыталі. Я кнігай уразілася, вось і кажу — вечар сабачны!*

* * *

Аня глядзіць на свой аўтапартрэт і кажа:

*— Падобна. І нос як... сукеначка.*

* * *

Ганначка:

*— Мама, у цябе такі голас мяккі.*

*— Мяккі?*

*— Так, вельмі мяккі.*

*— А ў астатніх?*

*— Таксама мяккі.*

*— Атрымліваецца, ва ўсіх мяккі?*

*— Не, толькі ў нашых сваякоў мяккі.*

*— А ў суседзяў цвёрдыя галасы?*

*— Не, не цвёрдыя. Але і не мяккія. У іх — тоўстыя галасы.*

* * *

Даша на пытанне «Навошта чалавеку вуха?» заўсёды дае адзін і той жа адказ:

*— Слухаць мора ў ракавінцы!*

* * *

Ганначка:

*— Мама, калі па праўдзе, да свайго нараджэння я думала, што ў мяне мама будзе горшай, чым ты цяпер.*

* * *

Ганначка:

*— Мама, я б ужо хацела, каб у мяне была маленькая дачушка і я б з ёй рабіла ўсё, што ты робіш са мной.*

**Занатавала мінчанка Наталля СЯЛЕЦКАЯ**

■ Сямейная кухня

# Шчыра радуюся і настальгую

**Калі я была маленькай, вельмі любіла атрымліваць папяровыя лісты. Памятаю, штодзень па дарозе са школы падбягала да цёткі Лены, якая разносіла пошту, з адным пытаннем: «А мне што-небудзь ёсць?» І нават калі атрымлівала адмоўны адказ, з надзеяй правярала паштовую скрыню: «А раптам яна памылілася...». Цяпер асабістыя паведамленні я атрымліваю, як правіла, па электроннай пошце. Таму штораз, калі Таццяна Іванаўна з аддзела лістоў прыносіць чарговы канверт у адрас «Сямейнай газеты», шчыра радуюся і настальгую... Дзякуй вам, даражэнькія! Пішыце часцей!**

**І не толькі на конкурс «Фотаздымак з гісторыяй». Актыўней далучайцеся да нашай «Сямейнай кухні». Дзяліцеся сваімі назіраннямі, жыццёвым досведам, тым, што хвалюе. Спрачайцеся з аўтарамі артыкулаў, задавайце пытанні, паведамляйце, пра што вам было б цікава прачытаць у наступных нумарах. А мо вы, як Кацярына Курачова і яе сабака-спартсмен пароды хаскі, не супраць трапіць на старонкі «Сямейнай» у якасці герояў? Дарэчы, менавіта Каця ў сацыяльных сетках падзялілася, на мой погляд, цікавым назіраннем:**

## ГЭТА Ж ДЗІЦЯ!..

*«Усё больш пачынае раздражняць адмазка некаторых бацькоў «Гэта ж дзіця!» У транспарце карапуз топчацца па сядзенні. «І што цяпер? Вунь, глядзіце, я змахну пясочак далонькай. Гэта ж дзіця!» У краме хлопчык бегае паміж паліц, скідае тавары, некаторыя падбірае і цягне ў рот. Не купляць жа татку цяпер пакамечаны снікерс! А вы не заўважылі і купіце. «Гэта ж дзіця!»*

*Раніцай у метро матуля прайшлася чаравікамі малога па ўсіх пасажырах, пакуль несла яго да выхаду. Выпацкала і мае светлыя нагавіцы. Цесна, стамілася, з торбамі, не заўважыла — усё разумею. Але яна проста паглядзела мне ў вочы, прыняла ножкі дзіцяці і стала ля выхаду! Ні «прабачце», ні вінаватай усмешкі. Нічога! Кажу: вы б хоць прабачэння папрасілі... Яна ў адказ: «Што?! У цябе нага адсохла ці што ад гэтага? Гэта ж дзіця!..»*



## ХТО І НЕ ЎМЕЕ — НАВУЧЫЦЦА

*«Сёння тэлебачанне можна папракнуць. Напрыклад, нават у выхадныя па многіх праграмах ідзе шмат фільмаў пра розных злачынцаў. А хочацца ж і іншага: паглядзець стары добры фільм, паспачуваць героям лірычнай драмы альбо пасмяяцца з цікавай камедыі.*

*Я, зразумела, не заклікаю ўвесці цэнзуру, але пэўныя абмежаванні павінны быць, — піша Аліна ВОЗНЕВА з Магілёва. — Бо тэлепрадукт спажываюць і дзеці, у якіх жыццёвыя прынцыпы толькі фарміруюцца. А пра стужкі, што, нібыта «майстар-клас», паказваюць, як дасягнуць жаданага любой цаной, мая старэнькая мама сказала вельмі трапна: «Хто і не ўмеў — навучыцца».*

## БУДЗЬЦЕ ПОБАЧ... ПА-САПРАЎДНАМУ

*Цэнтр псіхалагічных даследаванняў у Кітаі распрацаваў выдатную сацыяльную рэкламу (на фота). Слоган «The More You Connect The Less You Connect» («Чым больш вы звязаныя, тым менш вы звязаныя») красамоўна гаворыць аб сённяшніх рэаліях: калі вы побач са сваім дзіцем, будзьце па-сапраўднаму з ім. «Вельмі ў кропку, — лічыць матуля дваіх дзетак з Мінска Саша МЯСНІКОВА. — Кожны дзень назіраю, як мамы адрываюцца ад гульняў з дзецьмі, каб адказаць на апавяшчэнні ў сацыяльных сетках або «навіны пагартаць». Напэўна, таму ў мяне да гэтага часу не смартфон, а звычайная «гаварылка».*

Ну, і на дэсерт — радасная навіна. У выпуску «Сямейнай газеты» за 11 чэрвеня расказвалася пра сям'ю Селехаў з Кобрына, сёстры-трайняты з якой рыхтаваліся да выпускнога балю. Матэрыял называўся: «Вера, Надзея, Любоў, іх брат і бацькі».

Нядаўна аўтару, Святлане Яскевіч, пазваніла іх мама Марыя, расказала, што ўсе дзяўчаты паспяхова здалі тэсціраванне і паступілі на бюджэтную форму навучання ў ВНУ. Дзве будуць атрымліваць адукацыю ў Магілёве, адна — у Брэсце. Так што героі нашай публікацыі аказаліся не толькі прыгажунямі, але і разумніцамі.

Цяпер у сям'і Селехаў чацвёра студэнтаў (старэйшы іх сын вучыцца ў Мінску). Вядома, бацькам з невялікімі нават па мерках райцэнтра зарплатамі будзе не проста, але яны, упэўнена, справяцца: тут усе прывыклі падтрымліваць адно аднаго. А наваспечаным першакурсніцам хочацца пажадаць шчаслівых і цікавых студэнцкіх гадоў ды поспехаў у вучобе